1996 г. был собран богатейший археологический материал, позволяющий проследить развитие местного населения на протяжении всего неолита и раннего бронзового века.

При обследовании уже известных памятников были выявлены четыре новых стоянки людей бронзового века. Они были обозначены как Подгорная 1, 2, 3, 4. В процессе раскопок были сделаны выводы, что люди в этом поселении жили еще в раннем неолите. Под сильным влиянием культуры шароподобных амфор, культуры шнуровой керамики на местное население, тут сформировалась культура раннебронзового века.

## ЗАКІНУТЫЯ ТОРФАРАСПРАЦОЎКІ БЛІЗ В. М. КАЎПЕНІЦА І АНТАНОВА ЯК МЕСЦА ПРАВЯДЗЕННЯ СЕЗОННЫХ АРНІТАЛАГІЧНЫХ ЭКСКУРСІЙ ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ

***Ю. В. Трацяк***
*Эколага-біялагічны цэнтр*
*г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

Арніталагічныя экскурсіі з’яўляюцца даволі зручным і практычным спосабам для прылучэння дзяцей да жывой прыроды. У сілу таго, што пераважная большасць птушак адносна не пужлівыя і маюць буйныя памеры — гэта дазваляе арганізоўваць і праводзіць арніталагічныя экскурсіі для школьнікаў, якія маюць мад сабою мэту не толькі азнаямлення вучняў з жывой прыродай, але і фарміраванне экалагічна дасведчанай асобы. Зручным месцам для правядзення арніталагічнай экскурсіі намі былі абраныя закінутыя торфараспрацоўкі, што знаходзяцца на поўначы ад г. Баранавічы бліз в. М. Каўпеніца і Антанова.

Мэтай нашай працы з’яўляецца складанне новых маршрутаў для правядзення арніталагічных экскурсій для школьнікаў на дадзеныя водныя аб’екты.

На цяперашні момант намі распрацаваныя арніталагічныя экскурсіі на шматлікія водныя аб’екты ў тым ліку і на закінутыя торфараспрацоўкі. Для стварэння і правядзення першай арніталагічнай экскурсіі на дадзеныя водныя аб’екты былі

праведзеныя шматлікія палявыя выхады для вывучэння арнітафаўны вадаёмаў, а таксама вяўленне аптымальных месцаў для назіранняў школьнікамі за птушкамі. Паводле атрыманых дадзеных мы высветлілі, што пік відавой разнастайнасці і колькасці птушак выпадае на вясну — час, звязаны з вясенняй міграцыяй птушак. Крыху меней актыўнасць птушак супадае з восеньскай міграцыяй і перыядам гнездавання. У зімовы час дадзеныя водныя аб’екты замярзаюць і канцэнтрацыя птушак на торфараспрацоўках адпаведна значна зніжаецца. Такім чынам, намі былі распрацаваныя арніталагічныя экскурсіі ў розныя сезоны года на дадзеныя водныя аб’екты па абраным маршруце.

Намі было высветлена, што на закінутых торфараспрацоўках у перыяд восеньскай і асабліва вясенняй міграцыі птушак сустракаюцца не толькі звычайныя віды птушак, але і віды, якія занесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, што ў сваю чаргу павышае цікавасць вучняў да назіранняў за арнітафаўнай вадаёмаў.

Праводзячы шэраг такіх вузкаспецыялізаваных экскурсій, мы можам пазнаёміць вучняў і проста аматараў прыроды не толькі з відавой разнастайнасцю птушак, але і з экалагічнымі асаблівасцямі аб’ектаў, за якімі праводзіцца назіранне. Даследаванне і вывучэнне новых маршрутаў дазволіць найбольш ёмка і грунтоўна пазнаёміць вучняў з арнітафаўнай закінутых торфараспрацовак у ваколіцах в. М. Каўпеніца і Антанова.

**Спіс крыніц**

1. Санюк, Е. Н. Заброшенные торфоразработки Барановичского района как место концентрации птиц отряда Ржанкообразные (*Charadriiformes*) / Е. Н. Санюк, Ю. В. Третьяк, Н. Н. Чудук. // Содружество наук. Барановичи 2009: материалы V Междунар. науч.-практ. конф. молодых исследователей, 21—22 мая 2009 г., Барановичи, Респ. Беларусь / редкол.: В. Н. Зуев (гл. ред.) [и др.]. — Барановичи: РИО БарГУ, 2009. — С.127.
2. Третьяк, Ю. В. Водоплавающие птицы как объект наблюдения на орнитологических экскурсиях / Ю. В. Третьяк. // Актуальные проблемы экологии — 2007: тез. докл. III Междунар. науч.-практ. конф., Гродно, 21—23 нояб. 2007 г. / ГрГУ им. Я. Купалы; редкол.: Н. П. Канунникова (отв. ред.) [и др.]. — Гродно: ГрГУ, 2007. — 119 с.